УДК 882.6

І.М. Гоўзіч, дац., канд. філал. навук (БДПУ, г. Мінск)

# КАНЦЭПТАСФЕРА ЗБОРНІКА АНАТОЛЯ СЫСА “ALAIZA”

Адным з асноўных складнікаў карціны свету, у якім вызначаюцца дамінантныя рысы нацыянальна-культурнай ментальнасці, з’яўляецца канцэптасфера (сукупнасць канцэптаў – базавых элементаў светаразумення/светапазнання). У сучасным культуралагічным і лінгвістычным дыскурсах існуюць разнастайныя падыходы да вызначэння тэрміна “канцэпт”, побач з якім актыўна выкарыстоўваюцца паняцці “канстанта”, “ідэя”, “ключавое слова”.

Ужо ў ранніх вершах А. Сыса акрэсліліся канцэпты, якія сталі, па сутнасці, скразнымі ў яго паэіі: *Радзіма*, *маці*, *зямля*, *родная мова*, *свабода…*

Мастацкая рэалізацыя канцэпта *Радзіма* ў зборніку А. Сыса “ALAIZA” адрозніваецца ад усталяванай у нацыянальнай паэтычнай традыцыі, у межах якой вобраз роднай зямлі пераважна карэляваўся з канкрэтнымі рэаліямі і прадметамі пераважна светлай афарбоўкі, а творы ў цэлым зводзіліся да одапісу. “Прывязанасць” А. Сыса да зямных першаасноў адметная: за звычайнымі побытавымі з’явамі і рэчамі праглядаецца сімвалічны сэнс, прычым і канкрэтыка і сімволіка поўняцца драматычнай, і нават трагічнай, падсветкай, набываюць адценні акрэсленага гістарызму, філасофскага напаўнення. У канцэптуальным паэтычным разуменні Бацькаўшыны А. Сыс наблізіўся да яе асэнсавання пісьменнікамі-нашаніўцамі (найперш Я. Купалам і В. Ластоўскім). Шлях паэта да *Радзімы* пралягае ў А. Сыса праз поле *мовы*. Вера ў матчыну мову, у яе ачышчальную сілу з’яўляецца другой дамінантай стылю ў творчасці А. Сыса.

А. Сыс у форме трыяды канцэптаў *МАЦІ – МОВА – ВЕЧНАСЦЬ* выразна сфармуляваў ідэйна-эстэтычныя прыярытэты. Гэтыя канстанты сталі, па сутнасці, своеасаблівым кодам яго паэзіі. Звенні трыяды не могуць існаваць асобна: парушыцца сувязь – разбурыцца сістэма спрадвечных каштоўнасцей, загіне народ, нацыя.

Канцэпт *свабода* рэалізуецца ў творах А. Сыса праз вобразы *агню*, *крыжа*, *крыві*, *маці*, *радзімы*, *сейбіта*, *прарока*, *ваўка* і інш. Раскрываючы ідэйны змест канстанты *свабода*, паэт абапіраўся на асаблівасці міфалагічнага светаўяўлення далёкіх продкаў, на розныя пласты духоўных набыткаў нацыі. Канцэпцыя *свабоды* ў творчасці А. Сыса паслядоўна матэрыялізавалася ў кантэксце рэалій часу, што, у сваю чаргу, абумовіла наяўнасць аўтарскай сістэмы вобразаў, кампаненты якой набылі адметнае сэнсавае напаўненне.